**Кс. Раман Катлімоўскі**

Аўтар: jan_dax
15.11.2009 21:13

Ксёндз
Раман Катлімоўскі
- Нарадзіўся 7.08. 1963 г. у Грабоўскай Волі, Мазавецкага ваяводства.
- Закончыў ВДС у Сандаміры і Радоме.
- Атрымаў святарскія пасвячэнні 28. 05. 1988 г. у конкатэдры ў Радомю з рук біскупа Эдварда Матэрскага.
- Душпастырская праца: 1988 – 1990 г.г. – Радом, парафія імя св. Сям'і;
- 1990 г. – Ваўкавыск;
- 1990 – 1991 г. – Вільня, парафія імя Св. Духа;
- з 1991 г. – выкладчык і мадэратар у ВДС ў Гродне;
- з 1995 г. – рэдактар літургічнага календара Гродзенскай дыяцэзіі;
- у 2004 г. – абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэалогіі літургіі ў Каталіцкім універсітэце ў Любліне.

***"Святарства – гэта "новае нараджэнне ў Праўдзе. Імкнуся паглыбляць момант, калі я прыпаў да падлогі і на мяне былі ўскладзены апостальскія рукі падчас атрымання сакрамэнту Святарства, каб з надзеяй і радасцю служыць Хрысту ў братах. Бо крыніцай шчасця з'яўляецца "Пан, які накіроўвае мяне на сцежкі Праўды дзеля Імя свайго" (Пс 23, 3).***